УДК329(476)

# Дзейнасць беларуска–літоўскіх вайсковых фарміраванняў у 1918-1923 гг.

Багалейша С.В.
Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт

Адным з накірункаў беларуска-літоўскіх узаемаадносін у 1918-1923 гг. з’яўлялася вайсковае супрацоўніцтва. Беларускія вайсковыя часткі ў Літве адыгралі значную ролю ў абароне незалежнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці нашай Радзімы – Беларусі. 27 лістапада 1918 г. паміж ВБР і літоўскай Тарыбай (урадам Літвы) быў заключаны дагавор аб супрацоўніцтве. Адной з умоў дагавора і было стварэнне беларускіх вайсковых фарміраванняў у Літве. Кантралявала гэты працэс Міністэрства беларускіх спраў пры літоўскім урадзе. Фарміраванне беларуска-літоўскага войска пачалося ў Вільні. Былі сфарміраваны штабы 1-га і 2-га літоўскіх і 1-га і 2-га беларускіх палкоў. З выездам з Вільні фарміраванні літоўцаў былі перанесены ў Коўна, беларусаў – у Гродна. 1 снежня 1918 г. была ўтворана беларуская секцыя літоўскага Міністэрства абароны, якой кіраваў капітан Рэмішэўскі. Вайсковыя ступені ў беларускім войску былі аднолькавыя са ступенямі ў літоўскай арміі.

Пасля ліквідацыі 1-га гродзенскага палка палякамі беларускія вайсковыя фарміраванні знаходзіліся ў цяжкім стане: засталіся 5-я рота Віленскага палка (каля 200 чалавек), вартаўнічая частка (40 чалавек) і эскадрон гусар. У чэрвені 1919 г. у Коўна 5-я рота была перайменавана ў “1-шую Асобную беларускую роту”, а эскадрон у “2-ю Асобную беларускую роту”. 17 лістапада 1919 г. абедзве роты былі аб’яднаны ў Беларускі пяхотны батальён у складзе літоўскай арміі на чале з маёрам А.Ружанец-Ружанцовым. 1 красавіка 1920 г. Беларускі асобны батальён быў перафарміраваны ў Беларускую асобную роту. 27 верасня 1920 г. у Вільні пачалося фарміраванне Беларускага асобнага батальена (БАБ), камандзірам якога быў палкоўнік М.Успенскі. 25 красавіка 1922 г. БАБ быў перафарміраваны ў Асобную беларускую роту, якая ў тым жа годзе была расфарміравана.

Стварыць уласныя ўзброеныя сілы БНР так і не здолела, хоць беларусы вельмі разлічвалі на дапамогу літоўцаў. Яны спадзяваліся, што ў будучым гэтыя часткі змогуць стаць зародкам беларускага нацыянальнага войска. На пачатку літоўскі бок быў таксама зацікаўлены ў вайсковым супрацоўніцтве. Яго ўласныя ўзброеныя сілы былі нязначныя , а пагроза незалежнасці для Літвы з боку Польшчы і Савецкай Расіі была вялікай і рэальнай. Аднак паступова інтарэс да беларускіх частак быў страчаны.